УДК 027.7(739.5)

У.К. Слабін

Беларускі кнігазбор у бібліятэцы універсітэта штата Арэгон

У бібліятэцы універсітэта штата Арэгон у Юджыне (libweb.uoregon.edu) знаходзіцца адзін з найбуйнейшых у ЗША збораў карт і аэрафотаздымкаў. Тут больш за 2,2 мільёны кніг, відэа- і гуказапісаў, мікрафіш, электронных публікацый, а таксама падшыўкі больш за 15 тысяч назваў часопісаў. Пастаўленыя ў адзін шэраг, усе кнігі расцягнуліся б на 27 міль. Поруч з належнай кваліфікацыяй персаналу, дзве акалічнасці робяць працу ў бібліятэцы асабліва прыемным і прадукцыйным заняткам.

Першая – высокая ступень камп'ютэрызацыі. Пры адпаведным навыку пошук патрэбнай кнігі па электроннаму каталогу «Янус», дасяжнаму для студэнтаў і выкладчыкаў праз Інтэрнет і па-за межамі універсітэта, займае не болей хвіліны. Акрамя таго, бібліятэка ў Юджыне разам з 17 іншымі навучальнымі ўстановамі Паўночнага Захаду ЗША ўключана ў пошукавую сістэму «Орбіс» (orbis.uoregon.edu) і знойдзеную праз яе кнігу можна заўсёды замовіць па МБА.

Другая – высокая і, відаць, апраўданая ступень даверу да чытачоў. У надзеі на выхаванасць і ўнутраную культуру тут нават без прад'яўлення пасведчання кожнаму дазволены ўваход непасрэдна ў кнігасховішчы, дзе на паліцах побач з сучаснымі кнігамі стаяць выданні пачатку мінулага і другой паловы пазамінулага стагоддзяў.

Паводле вынікаў папярэдняга камп'ютэрнага пошуку, ключавое слова «Беларусь» змяшчалі анатацыі 464 кніг, што адпавядае пэўнай сярэдзіне ў параўнанні з прадстаўленасцю нашых суседзяў: «Расія» – 17193, «Польшча» – 2672, «Украіна» – 1371, «Літва» – 288, «Латвія» – 254. Аднак, далейшае непасрэднае знаёмства з фондамі дазволіла меркаваць, што колькасць кніг, якія так ці інакш датычаць Беларусі, напісаных альбо на беларускай мове, альбо беларускімі аўтарамі, тут не менш за тысячу.

Як паведаміў М. Бучкоўскі, спецыяліст універсітэта ў галіне ўсходнееўрапейскіх і расійскіх даследаванняў, зараз беларускія выданні, зрэшты, як і расійскія і ўкраінскія, трапляюць у бібліятэку праз пасрэдніцкія кнігагандлёвыя арганізацыі. Да 1991 г. паміж амерыканскімі выдавецтвамі і савецкім ведамствам «Международная книга» дзейнічала стабільная сістэма натуральнага кнігаабмену. Зараз жа «MIR International, Inc.» прапануе купляць кнігі, што нявыгадна для амерыканскіх бібліятэк. Акрамя таго, цікавасць не толькі тутэйшых, але і ўвогуле амерыканскіх студэнтаў да краін Усходняй Еўропы і СНД за апошнія гады істотна знізілася. Відавочна, беларускія бібліятэкі таксама не ў стане закупляць шмат амерыканскай літаратуры.

У ЗША кнігі замест УДК маюць пераважна шыфры Бібліятэкі Кангрэса. З улікам гэтай сістэмы, бадай, найбольшая колькасць беларускай літаратуры размешчана ў дамене PG2833-2835 (усходнеславянскае мова- і літаратуразнаўства). Тут 10 тамоў «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» пад рэд. А. Жураўскага (1982) і 3 тамы «Русско-белорусского словаря» пад рэд. К. Крапівы і П. Глебкі (1998), «Слоўнік антонімаў беларускай мовы: канкрэтныя выпадкі ўжывання» У. Лазоўскага (1994), «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы» пад рад. І. Мартынава (1978), «Слоўнік паронімаў беларускай мовы» С. Грабчыкава (1994), «Кароткі слоўнік беларускай мовы: правапіс, вымаўленне, націск, словазмяненне, словаўжыванне» Г. Арашонкавай і В. Лемцюговай (1994).

Сярод рарытэтаў можна адзначыць «Словарь белорусскаго наречія» І. Насовіча (1870) з ранейшымі штампамі «Библиотека Миргородской мужской гімназіи» і «Институт литературы ЦИК СССР им. М. Горького», а таксама «Белорусскія песні, съ подробными объясненіями ихъ творчества и языка, съ очерками народнаго обряда, обычая и всего быта» П.Бяссонава (1871) са штампам «Библіотека Ивана Александровича Вахромеева, Ярославль» і экслібрысам «Из книг А.В. Кокорева». Добра захаваліся «Очерки белорусской литературы» пад рэд. М. Янчука (Масква, 1920) са штампам «Центральная рабочая библиотека Моск. Губ. Сов. Проф. Союз».

Замежныя выданні прадстаўлены крытычным зборнікам «Далёкія і блізкія: беларускія пісьменнікі замежжа» (аб творчасці С. Яновіча, Я. Юхнаўца, Н. Арсеньевай, М. Сяднёва, Н. Артымовіч), Я. Чыквіна (Беласток, 1997), двухтомным падручнікам «Fundamental Byelorussian» В. Пашкевіч (Таронта, выдавецкі камітэт пры Каардынацыйным камітэце беларусаў Канады, 1978), тэматычна блізкім да вышэйзгаданага слоўніка А. Жураўскага «Historical Dictionary of Belarus» Я. Запрудніка (Ланхам, 1988). Ёсць тут і літаратурна-гістарычны зборнік «Opposition to Sovietization in Belorussian Literature, 1917-1957» Э. Адамовіча (Мюнхен, Інстытут вывучэння СССР, 1958). Сярод рарытэтаў у гэтай галіне варта згадаць «Geschichte der weissrussischen Volksdichtung und Literatur» Я. Карскага (Берлін, 1926).

Мастацкая літаратура – творы Я. Чачота, Я. Коласа, М. Багдановіча, К. Крапівы, П. Глебкі, П. Панчанкі, Я. Сіпакова, А Лойкі, У. Караткевіча, Я. Брыля, Н. Гілевіча, У. Карызны, М. Лобана, Б. Бур'яна – прысутнічае тут часткова ў перакладах на англійскую, або рускую мовы. Асабліва шырока прадстаўлена творчасць В. Быкава, у тым ліку ў перакладах на англійскую мову: «His Batallion, and Live until Dawn» (Нью-Йорк, 1981), «Sign of Misfortune» (Нью-Йорк, 1990). Ёсць і проста «Дыялогі з Васілём

Быкавым» Ю.Залоска (1995). Каля 20 кніг прыпадае на крытыку, публіцыстыку і мастацкія творы А. Адамоеіча і С. Алексіевіч.

Не менш кніг знаходзіцца ў дамене DK507 (усходнеславянская гісторыя). Тут «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» (1993), энцыклапедыя «Археалогія і нумізматыка Беларусі» (1993), іншыя даведачныя выданні на розных мовах, зборнік твораў і дакументаў К. Каліноўскага «За нашую вольнасць» ва ўкладанні Г. Кісялёва (1999), кнігі беларускіх гісторыкаў М. Ігнатовіча, М. Грынблата, В. Цітова, У. Палуяна, М. Улашчыка, І. Кузняцова, Я. Звяругі, З. Шыбекі, А. Дзярновіча, А. Лакоткі, тапаніміста В. Жучкевіча, а таксама калектыўныя творы супрацоўнікаў Інстытутаў гісторыі, мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі на розных мовах.

Замежныя выданні па беларускай гісторыі – гэта падшыўкі часопіса «The Journal of Byelorussian Studies» (Лондан, Англа-беларускае таварыства, 1965-88), кніга «Belarus: at a Crossroads in History» Я. Запрудніка (Болдэр, 1993) і сугучная з яе назвай «Belarus at the Crossroads» Ш.Гарнета і Р. Легвалда (Вашынгтон, 1999), «Belarus: from Soviet Rule to Nuclear Catastrophe» Д. Мэрплса (Нью-Йорк, 1986).

А чым прадстаўлены ў бібліятэцы Віцебск і Віцебшчына? Капі не лічыць згадак пра Віцебск у літаратуры, прысвечанай М. Шагалу, то такіх кніг усяго некалькі. Гэта вядомы «Витебск: энциклопедический справочник» пад рэд. І. Шамякіна (1988), бібліяграфічны ўказальнік «Витебск в десяти веках» Д. Генінай (1975), «Полоцк: исторический очерк» пад рэд. П. Петрыкава (1987), «Память: историко-документальная хроника Шумилинского района...» (1985), «Полоцк» пад рэд. І. Краўчанкі (1962). Віцебскае мастацтва адлюстравана ў перакладзенай на англійскую мову кнізе «Suprematism» К. Малевіча (Нью-Йорк, 1974), 5 музычных гуказапісах і партытуры А. Коппанда, якая называецца «Vitebsk: Trio for Piano, Violin and Violoncello» (Нью-Йорк, 1934). Але, бадай, самае ўсцешнае тое, што тут, у Юджыне, знаходзяцца матэрыялы міжнародных навуковых канферэнцый «Бахтинские чтения» (Віцебск, 1996, 1997, 1998) і міжнародных пленэраў «Малевич, УНОВИС, современность» (Віцебск, 1997) пад рэд. Т. Катовіч, якія былі выдадзены ВДУ і яго былым выкладчыкам М. Паньковым.

Дзіўна пры гэтым, што ў бібліятэцы хаця і ёсць адпаведныя крытычныя нарысы, але цалкам адсутнічаюць творы Я. Купалы. Таксама адсутнічаюць выданні Беларускага Інстытута навукі і мастацтва (Нью-Йорк). Зрэшты, ёсць каталог кніг Нью-Йоркскай публічнай бібліятэкі, надрукаваных на царкоўнаславянскай мове і глаголіцы, складзены супрацоўніцай БІНіМа З. Кіпель (1996). У цэлым, з увагі на вялікую адлегласць паміж Віцебскам і Юджынам, можна лічыць, што даследаваны беларускі кнігазбор у пэўнай ступені задавальняе патрэбы тутэйшых студэнтаў і беларускай дыяспары.

Артыкул падрыхтаваны ў часе знаходжання аўтара ў ЗША ў 2001 г. па праграме «Рэгіянальныя навукоўцы» (Regional Scholar Exchange Program), якая фінансуецца Бюро адукацыйных і культурных абменаў Дзярждэпартамента Злучаных Штатаў Амерыкі паводле Акту Фулбрайта-Хейса (1961) і кіруецца Амерыканскімі Радамі па міжнароднай адукацыі (ACTR/ACCELS).

S U M M A R Y

The University of Oregon Library, highly computerized and convenient in use, carries 2.2 million holdings including those pertaining to and published in Belarus and abroad. Most Belarus-related editions, totally circa 1,000, are in the literature and history domains. However, no Y. Kupala poetry and editions of Belarusian Institute of Arts and Sciences (N.Y.) are present. There are also abstracts of some international conferences published at Vitsyebsk State University (1996-98).

Поступила в редакцию 15.03.2003